*А.М.ЕМЯЛЁВА*

# СТАРАЖЫТНЫ ВІЦЕБСК
# ЯК АБ'ЕКТ КРАЯЗНАЎЧАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Гісторыя любога горада патрабуе комплекснага падыходу ў яе вывучэнні. Каб гэта было магчыма, неабходна разглядаць горад як цэлае, што арганічна развіваецца. Пры комплексным падыходзе неабходна вывучэнне:

— мясцовасці горада, яго геаграфічнага становішча;
— гісторыі ўтварэння і развіцця горада;
— сацыяльна-эканамічнага аблічча;
— уплыву розных культур на жыццё горада;
— месца горада ў культуры і быце краіны ў цэлым;
— сучаснага стану развіцця горада.

Неабходнай часткай вывучэння з'яўляюцца звесткі аб дзеячах навукі і культуры, імёны якіх звязаны з даследаваннем гісторыі горада. У гэтым выпадку, безумоўна, гаворка ідзе не толькі аб айчынных даследчыках, але і аб замежных.

Вывучаючы культуру Віцебска, трэба ўспомніць імя Аляксея Парфёнавіча Сапунова (1852—1924), раскрыць значнасць яго прац. Пры жыцці ім было надрукавана 72 выданні, у якіх утрымліваюцца звесткі пра Беларусь. Працы выдатнага даследчыка Віцебшчыны можна падзяліць на тры групы:

1) зборнікі гістарычных матэрыялаў, актаў і дакументаў, спісы і паказальнікі;
2) навуковыя даследаванні і ўступныя артыкулы да гістарычных зборнікаў;
3) артыкулы і творы, разлічаныя на масавага чытача.

Да першай групы адносіцца зборнік гістарычных дакументаў "Витебская старина", у якім сістэматызавана пададзены матэрыялы і дакументы, што тычацца Віцебска-Полацкага краю. Другая група прац зрабіла імя А.П.Сапунова вядомым за межамі айчыны. Сярод іх – кніга "Река Западная Двина". Трэцяя група кніг мае асаблівае значэнне, бо яна прыцягнула ўвагу мясцовай інтэлігенцыі да свайго краю, дзякуючы чаму многія помнікі Віцебшчыны не зніклі.

Тэмы прац А.П.Сапунова разнастайныя. Сучаснаму даследчыку мінулага Віцебшчыны немагчыма без іх абысціся, бо яны прысвечаны розным эпохам культуры Беларусі, грамадскаму жыццю тых часоў.

Паводле працы А.П.Сапунова "Кароткі нарыс гісторыі Віцебска" гісторыю горада можна падзяліць на пяць перыядаў:

1) беларускі старажытны (1021—1320 гг.), калі Віцебск меў цесныя сувязі з Полацкам і з'яўляўся адносна самастойным; яго называлі "вечавым", бо на працягу 300 гадоў у горадзе дзейнічала веча;
2) беларуска-літоўскі (1321—1569 гг.), або перыяд "устаўных грамат", калі Віцебск уваходзіў у склад ВКЛ;
3) магдэбургскага права, які працягваўся больш за 200 гадоў (1569—1772), пачаўся ён пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай;
4) беларуска-расійскі (1772—1924 гг.), пачаўся пасля далучэння Віцебска і ўсёй усходняй часткі Беларусі да Расіі і пераўтварэння горада ў прамысловы цэнтр;
5) далучэння да новай беларускай культуры.

Адны даследчыкі сцвярджаюць, што горад заснаваны ў 947 г., другія – у 974 г., трэція – у 1021, гэта год першага ўспаміну горада ў летапісах. Многія пагаджаюцца, што заснаваны ён вялікай княгіняй Вольгай. Яна пабудавала ў Віцебску Благавешчанскую царкву, якая існуе і цяпер. (У апошні час помнік сталі адносіць да XII ст.) Адносна назвы горада трэба сказаць, што Віцебск успамінаецца ў Летапісу г. Віцебска як Відбеск (ад назвы рэчкі Відзьба). Затым гісторыя Віцебска шмат у чым вызначаецца гісторыяй Полацка, з якім ён быў звязаны агульнымі інтарэсамі і супольным гістарычным жыццём. Самым выдатным князем полацкім быў Усяслаў Брачыславіч, названы Чарадзеем. Пры гэтым князі ў склад Полацкага княства ўвайшло Віцебскае княства.

Пасля смерці Усяслава Полацкае княства з-за спрэчак сыноў князя пачынае занепадаць, Віцебск становіцца больш самастойным горадам, але неўзабаве пераходзіць у залежнасць то ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

смаленскіх, то чарнігаўскіх князёў. Пасля 1320 г., пры Альгерду, Віцебск увайшоў у ВКЛ. Пачынаецца другі перыяд ў гісторыі Віцебска.

Пасля Альгерда вялікім князем стаў яго сын Ягайла, пры якім горад стаў сведкай шэрага крывавых падзей. На невялікі час пасля смерці Ягайлы ў княстве настаў адносны пакой, але князі маскоўскія ўжо пачыналі рыхтавацца да захопу Віцебска і іншых беларускіх гарадоў. З мэтай развіцця самакіравання ў 1503 г. Віцебску дадзена Устаўная грамата. Акрамя гэтага, рабіліся крокі да ўмацавання і развіцця горада як важнай памежнай крэпасці, распачатыя яшчэ Альгердам. Ён узмацніў Верхні замак каменнай сцяной, а Ніжні – драўлянай.

У канцы другога перыяду (1563) спачатку Полацк і ўся ўсходняя частка Віцебскага княства (за выключэннем Віцебска) былі заваяваны Іванам Грозным. Віцебск пасля доўгай і ўпартай абароны быў узяты графам Шарамецьевым у 1654 г., а ў 1667 г. у адпаведнасці з Андрусаўскім замірэннем адышоў да Рэчы Паспалітай. Унутранае грамадзянскае жыццё горада ў той час рэгулявалася "жалаванымі граматамі" на магдэбургскае права, якое давала мяшчанам асобны ўласны суд і права на самакіраванне. У гэты час Віцебску быў дадзены і герб горада.



Герб г. Віцебска 1597 г.

З 1772 г., з часу далучэння Віцебска да Расіі, пачынаецца новы перыяд гісторыі горада, які ў 1802 г. стаў цэнтрам Віцебскай губерні. Вайна 1812 г. значна закранула горад і прывяла да голаду, дарагоўлі, эпідэміі халеры. Жыхароў у пачатку 1812 г. было каля 7 тыс., а ў 1813 г. – толькі 2,5 тыс.

З 1923 г. пачаўся новы перыяд у культурна-гістарычным жыцці горада.

А.П.Сапуноў надаваў увагу і тапаграфічнаму становішчу горада і замкаў. Ён адзначаў, што старажытная частка Віцебска знаходзілася якраз там, дзе былі Верхні і Ніжні замкі. Потым горад пашыраўся на правым беразе р.Віцьбы, і гэтая частка стала ўласна горадам. Які выгляд мелі замкі і горад, паказвае чертёж г.Витебска 1664 г., дзе відаць, што ў Верхнім замку было 6 вежаў, у дыяметры ён меў 396 сажняў, а ў Ніжнім замку – 13 вежаў, а ў дыяметры ён меў 590 сажняў. Абодва замкі складалі ў акружнасці каля дзвюх вёрстаў. Уласна горад, які быў таксама ўзмоцнены, меў у акружнасці 529 сажняў, гэта значыць, крыху больш за вярсту. Акрамя замкаў і ўласна горада, у палове ХУІІ ст. былі наступныя прадмесці: Заручаёўскае, Задунайскае, Слабадское, Рускае. А.П.Сапуноў адносна ліку жыхароў да пачатку ХІХ ст. ніякіх звестак не паведамляе (вядома толькі пра 1010 сядзіб). Але ж дзякуючы ўважлівасці замежных падарожнікаў, аб якіх будзе ісці гаворка пазней, мы атрымалі і гэтую інфармацыю.

Даследчык гісторыі А.П.Сапуноў адзначае росквіт Віцебска на мяжы XVI–XVII стст. З таго часу горад збяднеў, занепаў і яшчэ доўга не мог вярнуць былую моц. Уздым культурнага жыцця горада назіраецца ў канцы XVIII—XIX ст.

Сярод іншых крыніц цікавую інфармацыю аб гісторыі Віцебска, геаграфічным, сацыяльна-эканамічным, культурным становішчы горада, стане навукі і адукацыі ўтрымліваюць працы вядомага беларускага даследчыка А.Мальдзіса. Дзякуючы ім стала магчымым сабраць і сістэматызаваць звесткі з мінулага, адлюстраваныя ва ўспамінах людзей, якія пабывалі ў Беларусі і пакінулі свае апісанні старажытнага Віцебска. У свой час яны фарміравалі ў Еўропе ўяўленні пра наш край і яго народ. І нам таксама цікава паглядзець на Беларусь вачыма чужаземцаў. Іх успаміны даюць уяўленні аб жыцці нашых продкаў, вучаць паважаць гісторыю края, шанаваць памяць тых, хто жыў на нашай зямлі да нас і спрыяў яе росквіту. Пра старажытную Беларусь пісалі не толькі падарожнікі, але і вучоныя-гісторыкі, храністы. Яны добрасумленна сістэматызавалі інфармацыю, прыводзілі падрабязныя звесткі аб з'явах, якія адбываліся ў розныя часы на нашай зямлі.

Пра гістарычнае мінулае Віцебска, яго геаграфічнае становішча ўтрымліваюць звесткі ўспаміны Б.І.Куракіна (1705—?) – рускага князя, удзельніка вайны са шведамі; А.Майерберга (1662—?) – пасла Свяшчэннай Рымскай імперыі; Р.Гейдэнштэйна (1556–1620), аўтара «Записок о Московской войне» (1582); А.Гваньіні (1538—1614), які служыў у Віцебскім гарнізоне наёмным ротмістрам, з 1569 г. па 1587 г. быў камендантам Віцебска; В.М.Севяргіна (1765–1826) – рускага акадэміка, калежскага саветніка; У.Б.Бранеўскага (1784–1835) – ваеннага пісьменніка; М.П.Жданава – прадстаўніка рускага дваранскага роду XIX ст., аўтара «Путевых записок по России в 20-ти губерниях»; Д.І.Мацкевіча (1819–1859) – цэнзара Санкт-Пецябургскага цэнзурнага камітэта, пісьменніка, і інш. Іх сведчанні дазваляюць узнавіць некаторыя старонкі гісторыі горада.

Напрыклад, з успамінаў А.Майерберга можна даведацца аб падзеях 1623 г., калі жыхары паўсталі супраць біскупа Іясфата Кунцэвіча, за забойства якога горад быў літаральна ператвораны ў сяло. Р.Гейдэнштэйн пралівае святло на тое, як Віцебск стаў цэнтрам ваяводства. Аказваецца, што пасля Люблінскай уніі трэба было стварыць аднолькавыя ўмовы для кіруючых класаў ВКЛ і Каралеўства Польскага. Таму ўлады вырашылі мець роўную колькасць літоўскіх і польскіх сенатараў, у выніку чаго і былі створаны Віцебскае і Полацкае ваяводствы.

Цікавыя звесткі аб геаграфічным становішчы Віцебска знаходзім у працах А.Гваньіні. У яго ўспамінах, якія адносяцца да XVII ст., адзначана, што гэта быў даволі прасторны драўляны горад над вялікай суднаходнай ракой Дзвіной, па якой правозілі розныя тавары ў Рыгу. Аб тым, што гэта за тавары, расказвае В.М.Севяргін. Ён падкрэслівае, што асобныя гарады, мястэчкі і ваколіцы Віцебска славіліся сваімі рамёствамі. Тут рабілі брычкі, кузавы, якія пляліся з сасновых карэнняў. Дзякуючы развіццю сельскай гаспадаркі, мануфактур і рамесніцтва ў першай палове XIX ст. ажывіўся гандаль. Па рацэ прыязджалі гандляры нават з Італіі, Грэцыі і Персіі. Сярод тавараў першае месца займалі тэкстыль, эстампы, кнігі на рускай, польскай і французскай мовах.

Віцебск славіўся штогадовымі кірмашамі. Віцебскі кірмаш размяшчаўся насупраць будынка гарадской ратушы. Народу на кірмашы з'язджалася шмат (больш за 3 тыс. чалавек); на іх прадаваліся пераважна замежныя тавары: шоўк, палотно, батыст і інш. З Вільні звычайна прыязджала драматычная трупа, паказвалі свае прадстаўленні цыркачы. А ў драўляным павільёне "Сабачая горка" можна было патанцаваць да стомы. Абавязковымі ўдзельнікамі кірмашу былі музыканты, якіх называлі дударамі.

Падарожнік і вучоны В.М.Севяргін пакінуў нам цікавыя апісанні Віцебска, яго аўтар называе "вялікім губернскім горадам". Ён адзначаў, што працягласць яго складала дзве вярсты, шырыня – адну, а ў акружнасці ён меў сем вёрст. Дзяліўся горад на сем частак: Замкавую, Заручаёўскую, Задунайскую, Падзвінскую, Узгорскую, Пескавацкую і Загарэцкую. Жыхароў налічвалася каля 15 тыс. Да лепшых будынкаў (каля 2 тыс.) аўтар адносіў дом каменданта, магістрат, пошту, магазіны і мураваныя крамы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Панарама Віцебска з боку Віцьбы. *Акварэль І.Пешкі. Пачатак XIX ст.*

У горадзе над Дзвіной у пачатку XIX ст. пабываў У.Б.Бранеўскі. Свае захапленні і ўражанні ён падмацоўваў апісаннем прывабных месцаў і архітэктурных помнікаў. У горадзе мелася мноства цэркваў, манастыроў, значная колькасць мураваных будынкаў, якія перамешваліся з драўлянымі пафарбаванымі знадворку і правільнай архітэктуры домікамі, вуліцы былі шырокія і брукаваныя, асвятляліся ліхтарамі. Даследчыка зацікавілі і публічны сад з галерэяй для танцаў, і першая хрысціянская царква на Русі, пабудаваная княгіняй Вольгай, а ў царкве – рэдкае пісанае Евангелле. Сама царква ўразіла пісьменніка строгімі вытанчанымі архітэктурнымі формамі.

Больш стрымана Віцебск апісаў А.Башняк. Ён адзначаў, што ў архітэктуры манастыроў, касцёлаў і цэркваў панаваў даволі своеасаблівы стыль. Яны не маглі б спадабацца аматарам навейшай архітэктуры, хоць і заслугоўвалі ўвагі. Гэтаму было сваё тлумачэнне: Віцебск бесперапынна ваяваў, і культавыя пабудовы павінны былі ўзмацняцца і прымаць рысы абарончых. На думку А.Башняка, лепшыя будынкі знаходзіліся ля каменнага моста праз Віцьбу. Гэта былі генерал-губернатарскі дом, прысутныя месцы і сабор. Колькасць жыхароў даследчык пазначыў 22 тыс. Але другі падарожнік — Р.Пінкертон — вызначаў колькасць жыхароў горада ў 1820-х гг. лічбай 14 тыс.

Найбольш грунтоўныя апісанні Віцебска былі зроблены Д.І.Мацкевічам і М.П.Жданавым у 1840—1850-я гг. Першаму з іх прыйшліся да спадобы маляўнічыя берагі Дзвіны, злучаныя драўляным мостам, Смаленская вуліца, якая лічылася лепшай, Біржавая плошча, на якой узвышаўся двухпавярховы будынак гарадской ратушы з высокай вежай, гарадскі бульвар, што цягнуўся ад дома генерал-губернатара да Успенскага сабора. Папулярнасцю карыстаўся публічны сад бліз Пецярбургскай заставы, на танцавальных вечарах якога бавілі час багатыя гараджане. Кніжных лавак Д.Мацкевіч не заўважыў. Шыльды на магазінах былі аляпаватыя, і нават падпіска на танцавальныя вечары праводзілася ў кандытарскіх магазінах.

Маляўнічую панараму Віцебска XIX ст. апісаў М.П.Жданаў. Ён назваў архітэктуру храмаў (большай часткай каталіцкіх) зграбнай і цудоўнай. Лепшыя з іх – кляштары базыліянскі, перароблены ў праваслаўны сабор, і езуіцкі. "...Насупраць прысутных месцаў разбіты бульвар, адкуль відаць увесь зарэчны горад, мост цераз раку, барскі, дом, удалечыні ўніз па Дзвіне – Маркаў манастыр, адразу за горадам ... горы ў сіняве..." [1]. Гэты ландшафт М.Жданаў вызначаў як адзін з самых лепшых, якія ён бачыў у час падарожжа, а аб'ехаў падарожнік 22 губерні і ўсё ж аддаў перавагу Віцебску.

Сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі таго часу апісвалі ў сваіх падарожжах Г.Р.Дзяржавін (1743—1816), вядомы рускі паэт, і М.П.Жданаў. Калі першы быў уражаны расслаеннем насельніцтва, пры якім магнаты ўсё больш багацелі, а сяляне беднелі, жудаснай карцінай галадоўкі, народнага гора (асабліва ў вёсцы князя Марцыяна Агінскага пад Віцебскам), то другі падарожнік адзначаў памешчыкаў, якія займаліся паляпшэннем умоў жыцця сялян. Гэта былі памешчыкі Гернгрос, Храптовіч, Ціханавецкі, Грабніцкі, Платэр, Паўлі, Борлу, Храпавіцкі. Але ж, зразумела, гэта былі прыклады, у большай ступені не ўласцівыя для тагачаснага сацыяльна-эканамічнага становішча Беларусі.

Што тычыцца культурнага жыцця Віцебска, то вельмі сціплыя звесткі ўтрымліваюць успаміны такіх падарожнікаў, як Д.І.Мацкевіч, В.М.Севяргін і А.Мейер (1832—?) – германскі палітычны

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дзеяч, па прафесіі юрыст. Ён адзначаў, што ў XVIII–XIX стст. побач з народнай развівалася і феадальная культура. Магнаты ў сваіх маёнтках стваралі аркестры, харавыя капэлы, тэатральныя калектывы. Напрыклад, такія вакальна-інструментальная і ўласна інструментальная капэлы існавалі ў 1830-я гг. у Віцебску пры двары Марцыяна Агінскага, якія разам з музычнымі тэатрамі М.К.Радзівіла ў Нясвіжы, М.К.Агінскага ў Слоніме, С.Г.Зорыча ў Шклове з'яўляліся заснавальнікамі традыцыі прафесійнага інструментальнага выканаўства на Віцебшчыне.

У першай палове XIX ст. у губернскіх гарадах набылі папулярнасць публічныя тэатры, у тым ліку і ў Віцебску. Звесткі аб дзейнасці такога тэатра ў Віцебску ёсць ва ўспамінах рускага пісьменіка Д.І.Мацкевіча, які піша аб прыгажосці і ўтульнасці тэатра, аб рэпертуары, які вандроўныя акцёры ігралі на рускай, польскай і часам нямецкай мовах. Акрамя таго, у тэатры адбываліся спектаклі аматараў, канцэрты, выступленні фокуснікаў і чэрававяшчальнікаў. Напрыклад, вядома аб гастрольнай дзейнасці ў 1850-я гады балетнай трупы пад кіраўніцтвам М.Піёна, нямецкай award трупы В. фон Шмідгофа, драматычнай трупы Я.Чаховіча.

Адначасова з развіццём музычнага, тэатральнага мастацтва пашыралася ў Беларусі і асвета. У Віцебску ў XIX ст., па сведчаннях акадэміка В.М.Севяргіна, былі тры вучылішчы: галоўнае народнае (на 111 вучняў) пры Успенскім праваслаўным саборы, на 78 вучняў пры езуіцкім і на 70 вучняў пры піярскім кляштарах. Акрамя вучылішчаў, другі вядомы даследчык Р.Пінкертон, шатландскі гісторык і географ XIX ст., адзначаў у Віцебску дзве семінарыі і гімназію. У той жа час В.М.Севяргін налічыў у горадзе 14 права- слаўных і уніяцкіх цэркваў, 5 каталіцкіх і 2 уніяцкія кляштары.

Нягледзячы на не зусім спрыяльныя ўмовы, Віцебск як суцэльны кангламерат працягваў развівацца. Адначасова з прыгнётам, галечай і цемрай феадальнага Віцебска мы ўяўляем другі бок горада – яго культурнае багацце, прыгажосць, традыцыі навукі і мастацтва, помнікі архітэктуры, якія з'яўляюцца неўміручымі каштоўнасцямі для сучаснага духоўнага жыцця горада і краіны.

---

1. *Жданов М.П.* Путевые записки по России в 20-ти губерниях. — СПб.: [Б.и.], 1843. — С. 175.
2. *Сченснович И.* На супрядке в Т-ах Вит. губ. — Витебск: Губ. тип., 1898. — С. 19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ